ПАДЗЕЯ



# СЛОВА ЎДЗЯЧНЫХ НАШЧАДКАЎ

**У Гродне прэзентавалі кнігу «Памяти вечный огонь», зборнік літаратурна-мастацкіх твораў, прысвечаных 80-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Лакацыяй для першага афіцыйнага знаёмства з новай кнігай стала Гродзенская гарадская гімназія імя А. І. Дубко.**

7 лютага Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі тут быў дадзены старт цыклу грамадскіх прэзентацый новага літаратурна-асветніцкага праекта, якім стала гэтая ўнікальная кніга, створаная пры фінансавай дапамозе Гродзенскага гарадскога савета ветэранаў. Выданне сабрала пад адной вокладкай сучасную паэзію, прозу і публіцыстыку ваенна-патрыятычнага характару на беларускай і рускай мовах ад аўтараў рознага ўзросту і рознага роду заняткаў, але аб'яднаных адной тэмай – тэмай памяці і ўдзячнасці народу-вызваліцелю за яго свяшчэнны подзвіг.

Кніга афіцыйна пачала свой шлях да чытача менавіта з установы адукацыі горада над Нёманам невыпадкова. Нашай моладзі прапанавана ўніверсальная магчымасць разглядаць кнігу і як падручнік па грамадзянскай свядомасці, патрыятызму і абароне гістарычнай праўды, а таксама як запрашэнне да супрацоўніцтва з калектывам аўтараў. Не за гарамі 80-годдзе Вялікай Перамогі. Да гэтай юбілейнай даты пісьменніцкая арганізацыя вобласці ўжо пры падтрымцы Гродзенскага абласнога савета ветэранаў рыхтуе да выхаду яшчэ адну тэматычную кнігу-альманах «Память огненных лет». Ваенна-патрыятычная тэматыка літаратуры становіцца дамінуючай. Яна мабілізуе грамадзянскае сумленне, азірнуўшыся назад, дапамагае асэнсаваць многае з таго, што сёння адбываецца ў навакольным свеце і навесці парадак у сістэмах нашых каштоўнасцяў. Але творы з кнігі «Памяти вечный огонь» *(выдавецтва «ЛітАРы», Гродна, 2024)* пазбаўлены афіцыёзу, пафасных лозунгаў і пампезных заклікаў. Абраныя літаратарамі Гродзеншчыны сродкі мастацкасці спрыяюць наладжванню сяброўскага, нефармальнага дыялогу з чытачом, пераконваюць і ўражваюць уласцівымі беларускаму народу шчырасцю, мудрасцю, спагадай, душэўнай цеплынёй і прастатой. Гэта адзначыла ў сваім уступным слове да прэзентацыі яе вядучая, старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Людміла Антонаўна Кебіч, рэдактар кнігі. Гістарычныя дакументы і аўтарскія сюжэты, творчая фантазія і дакладныя факты – усё гэта інструментар, які дапаможа чуламу сэрцу чытача адгукнуцца на кнігу. За падтрымку ініцыятывы па стварэнні тэматычнага зборніка «Памяти вечный огонь» калектыву Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ выказаў шчырую ўдзячнасць старшыня Гродзенскага гарадскога савета ветэранаў Аляксандр Мікалаевіч Радзівонаў.

Пачалася дзея з падарунка ад гаспадароў. Верш нашага калегі, паэта Аляксандра Марозава прачытаў вучань гімназіі. На старце свята новай кнігі выступіў яе рэдактар, член СПБ Дзмітрый Радзівончык. Паэт, публіцыст, літаратуразнавец прапанаваў аўдыторыі крытычны агляд зборніка і зрабіў акцэнт на некаторых яго асаблівасцях. Імпрэзу працягнулі: член СПБ, ветэран Узброеных сіл, паэт Браніслаў Ермашкевіч (у кнізе выступіў як публіцыст); маладыя паэты Андрэй Дарожкін і Вольга Алізар; член Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб’яднання «Надзея», паэтэса Святлана Глембоцкая (выступіла як празаік); эстафету працягнулі паэтэсы Вольга Пянькова і Соф’я Судзына («Надзея»); ветэран архіўнай справы, публіцыст Карына Батракова і член СПБ, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі, дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая (выступіла як паэтэса); а таксама члены СПБ: паэт з Ліды Руслан Півавараў і гродзенская паэтэса Людміла Шаўчэнка. Мерапрыемства таленавіта ўпрыгожылі, істотна ўзбагацілі яго палітру эмоцый музычныя (вакальныя, вакальна-харэаграфічныя і інструментальныя) нумары ў выкананні вучняў Гродзенскай гарадской гімназіі імя А. І. Дубко. Ад калектыву аўтараў установе адукацыі былі ўручаны экзэмпляры зборніка «Памяти вечный огонь». Будзем спадзявацца, што агучанае мастацкае слова трапіла ў сэрцы моладзі і стала для яе голасам існіны. Яна – у неабходнасці вечна шанаваць подзвіг герояў-вызваліцеляў, памятаць трагічны ўрок гісторыі і зберагчы мірнае неба над Беларуссю. Цікава, што сярод літаратараў, удзельнікаў мерапрыемства знайшлося некалькі выпускнікоў гімназіі (якая ў мінулым была проста сярэдняй школай нумар 1 горада Гродна). Шэсце кнігі «Памяти вечный огонь» па ўстановах адукацыі і культуры Прынёманскага краю пачало адлік прыўзнятага настрою, яркіх уражанняў і апладысментаў.

Працяг будзе.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** удзельнікі прэзентацыі кнігі «Памяти вечный огонь», зборніка літаратурна-мастацкіх твораў, прысвечаных 80-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гродзенская гарадская гімназія імя А. І. Дубко. 7 лютага 2025 года.



**Будзем спадзявацца, што агучанае мастацкае слова трапіла ў сэрцы моладзі**




**У выкананні чытальніка-гімназіста гучыць верш члена СПБ і СПР, паэта Аляксандра Марозава**





**Л. А. Кебіч**




**А. М. Радзівонаў**



**Дзмітрый Радзівончык**





**Паэт Браніслаў Ермашкевіч належыць да катэгорыі «дзеці вайны»**



**Андрэй Дарожкін (выступіў у кнізе як паэт і як публіцыст)**



**Паэтэса Вольга Алізар**



**Святлана Глембоцкая**





**Вольга Пянькова**




**Паэт Руслан Півавараў (Ліда)**



**Людміла Шаўчэнка**



**Карына Батракова**





**Ганна Скаржынская-Савіцкая**



**Соф’я Судзьіна**





**Пасля мерапрыемства**

***Фота*** Аляксандра Сявенкі